**Андрэй Хадановіч**

# Бэрлібры

## Гісторыя ў чатырох фільмах

KAMUNIKAT.ORG

KAMUNIKAT.org

Тэрмін “бэрлібр” прыдумалі мае сябры Ўладзімер Арлоў і Марыйка Мартысевіч для маіх бэрлінскіх вэрлібраў. З таго часу я яшчэ пару разоў пабываў у Бэрліне дый іншых гарадох, дзе працягваў пісаць у азначаным жанры. Скончылася тым, што “бэрлібры” сталі прыдумляцца нават у Менску. Карыстаюся нагодай выразіць удзячнасьць свайму калегу па жывым дзёньніку _*кит*_, без дапамогі якога гэта кніжка зьявілася б значна пазьней, а таксама бэрлінскаму “Літаратурнаму Калёквіюму” й кракаўскай “Віле Дэцыюса”, безь якіх гэта наагул была б зусім іншая кніжка.

## Дзіцячая чыгунка

С. Ж.

Вершы
прыбываюць на тваю станцыю,
як цягнік Люмьераў,

як першы
нямы,
чорна-белы кінэматограф.

І ты мусіш тлумачыць фільм,
дагаворваць,
казаць каляровыя словы,
складаць субтытры радкоў.

А кіно –
гукавое даўно:
каляровая рыфма
гучыць непрыстойна.

І ўся надзея на мову,
незразумелую тут
без субтытраў.

KAMUNIKAT.org

# I. Касец газонаў

KAMUNIKAT.org

***Стары паэт***

Стары паэт
ня мае шкодных звычак,
бо ад сьпіртнога зранку бывала пякотка,
а ад цыгарэтаў жаўцелі зубы;
потым зубоў ня стала,
ды не мяняць жа звычак на схіле гадоў.
Што да наркотыкаў,
дык ён мог бы намякнуць на знаёмства зь імі
дзеля таннай папулярнасьці ў моладзі,
але хай моладзь сама
дбае пра танную папулярнасьць,

а стары паэт
шырока вядомы,
хоць і ў вузкіх колах,
затое настолькі шырока,
што юныя літаратары
пасьля паэтычных чытаньняў,
апынуўшыся ў прыбіральні
ля суседняга з мэтрам пісуара,
ад хваляваньня забываюць расшпіліць прарэх.
“Вось здорава! – думае паэт. –
Я б так ня змог!”

Бо стары паэт
прачытаў за жыццё
сорак восем кніжак,
дваццаць дзьве зь якіх былі ягоныя,
яшчэ да дваццаці дзьвюх ён напісаў перадмовы,
а першыя чатыры ён памятае смутна;
хоць мае на паліцы
дзьве з паловай тысячы томікаў сваіх калегаў,
усе, вядома ж, з аўтографамі,
каб, Божа барані, ня здаў у букіністычную кнігарню,
але ён часам такі здае.
У маладосьці зь яго кпілі за неадукаванасьць
ды іранічна казалі: “Вучыцца, вучыцца й вучыцца!”,
а цяпер не, таму

што стары паэт
наведаў дзьве з паловай тысячы школаў,
каб кожная навучэнка,
апроч вечару страты нявіннасьці
ды выпускной вечарыны,
запомніла яшчэ і ягоную творчую вечарыну,
але ж ніводная не запомніла,
а калі якая й пазнае яго на вуліцы,
дык аказваецца
суседкаю па лесьвічнай пляцоўцы
альбо ўнучкаю.

Стары паэт
дагэтуль хвалюецца перад выступамі,
думаючы, ці будуць крычаць “брава!”
ды выклікаць “на біс”,
і таму чытае з падкрэсьленым выклікам,
нібы пытаючы: “Хто тут супраць мяне?
Вы за ці супраць?”
Але ўсё абыходзіцца,
і заля дружна крычыць:
“ЗА!” і “БІС!”.

### ***Прагрэс у літаратуры***

А ўсё-ткі меў рацыю
францускі казачнік,
які кляўся й бажыўся,
што ёсьць ён, прагрэс у літаратуры.

Сёньняшні Гамэр
ніяк не залежыць
ад перабояў электраэнэргіі,
цалкам можа кіраваць
новай Нацыянальнай бібліятэкай,
хоць у душы крыху зайздросьціць
Рансару й Бэтховэну:
найлепшыя творчыя вечарыны
ладзіліся ў ДК таварыства глухіх.

Сапфо
больш не балятуецца на пасаду
дзясятай музы,
бо адмовілася на карысьць кінематографа;
і хоць не спазнала шчасьлівага каханьня,
затое атрымала свой нобэль
за прапаганду паліткарэктнасьці,
апярэдзіўшы Вэрлена, Рэмбо і Жорж Санд.

Стары Анакрэёнт
даўно кінуў піць
і можа толькі мроіць пра дзяўчатак,
затое ўключаны ў праграму
ўсіх школ і ўнівэрсытэтаў Грэцыі.

Віён
на поўніцу адчуў
усемагутнасьць праваабаронцаў,
хоць у краіне так і не скасавалі
сьмяротнага пакараньня,
а нават калі скасуюць –
што зьменіць купка дысыдэнтаў
з транспарантамі “дзе Віён?”

Усімі адрынуты Гюго
на ўласным досьведзе зьведаў,
што выраз “мецьгемарой”
мае ня толькі пераносны сэнс.
Затое цяпер ёсьць шоў-бізнэс
і можна пісаць словы на музыку.

Ганкур
вядзе жывы дзёньнік у інтэрнэце.
Пакутуе на падваеньне асобы.

Фолкнэр і Маркес
канкуруюць на рынку турпаслугаў,
прапануючы гарачыя туры
ў Ёкнапатафу і Маконда.

І толькі Катул
не адчуў асаблівых зьменаў:
як дзьве тысячы зь нечым год таму,
ён аплаквае вераб’я сваёй каханай.
Птушыны грып, знаеце…

KAMUNIKAT.org

## ***Самсон***

“Увага:
у цырульні
абслугоўваюць вучні!”

Сядзіш у чарзе нерухомы,
падлучаны цераз вушы
да CD-прайгравальніка,
як да кропельніцы.

А як іначай, бо навокал –
папса з радыё філістымлянаў
у FM дыяпазоне!

(Дзядуля побач таксама пакутуе,
а быў бы меншым аслом –
даўно б запусьціў у прыймач
сваёй сківіцай!)

Твая чарга.
Здымаеш кропельніцу.
Сядаеш у фатэль.

Асьляплязьна прыгожая дзяўчына
закідвае цябе пытаньнямі.
“Патыліцу пакарацей.
Вушы адкрываем.
Астатняе – на Ваш густ.
І вось што яшчэ:
зьверху амаль не здымайце,
не, хай вось так і тырчаць,
гэта цяпер модна,
так, так, прыгажосьць – вялікая сіла...”

Пот і валасы
імкнуцца трапіць у вочы –
і вось ты ўжо нічога ня бачыш,
а дзяўчына
ўсё павышае сваю кваліфікацыю.

KAMUNIKAT.org

Нарэшце расплюшчваеш вочы,
глядзісься ў люстэрка і –
згадваеш свайго папярэдніка,
першага ў гісторыі тэрарыста,
які прынамсі ня ўбачыў
сваёй новай фрызуры...

Выходзіш вонкі.
Дождж цячэ па твары.
Дзяўчына зьмятае з падлогі
твае валасы.

KAMUNIKAT.org

### *Арфэй, Эўрыдыка, герпэс*

“Зорка Вэнэра ўзышла...”
Не, гэта не пачатак рамансу,
і нават ня чорная мша.
Гэта пазыўныя ў менскім мэтро.
“Паважаныя пасажыры,
не падыходзьце да краю плятформы!
Не заходзьце за абмежавальную лінію!
І не азірайцеся,
напраміласьць Бог, не азірайцеся!..”
Але ён такі азірнуўся.

Некалі ён іграў на скрыпцы
у падземным пераходзе,
і граў так,
што з усіх бакоў зьбіраліся
бяздомныя коткі й скінхэды,
і першыя клаліся ля другіх,
зачараваныя музыкаю.

Калі ён запільваў
“Dance me to your beauty with a burning violin”,
спыняліся ўсе навакольныя сабакі –
нямецкая аўчарка
і трое ейных спадарожнікаў ва ўніформе.
А аднойчы спынілася яна,
каб дакрануцца вуснамі да вуснаў
і адразу ж зьнікнуць у мэтро.

“Сука!” –
казаў ён назаўтра,
абмацваючы герпэс
і, зрэшты, зусім не жадаючы
пакрыўдзіць аўчарку ды іншых...

Потым былі ўцёкі й спробы схавацца
між пральняй і станцыяй “Інстытут культуры”.
На трэцця содні хаваньня ў мэтро
ён зноўку пабачыў яе.

Яна ўсьміхнулася, даючы зразумець,
што пойдзе за ім паўсюль,
і яны пайшлі: ён сьпераду, а яна за ім.
“Не азірайся,
напраміласць Бог, не азірайся!” –
падказваў унутраны голас
і ўсе супрацоўніцы менскага мэтрапалітэну.

Але ён такі азірнуўся і –
вядома ж, яна аслупянела,
зрабіўшыся калёнаю з выявай дзяўчыны.
(Цяпер яе лёгка знайсьці на станцыі мэтро
сярод іншых пэрсанажаў Якуба Коласа.)

“Мой родны кут, як ты мне…
Паважаныя пасажыры,
пры карыстаньні эскалятарам
не апускайце рэчаў
на прыступкі й парэнчы!
Пазьбягайце трапляньня душы
у шчыліны
між рухомымі й нерухомымі
часткамі эскалятару!..”

Тыя, хто чакаў
скрыпкі ў падземным пераходзе,
абламіліся – ён ня выйшаў.
Ён зьнік у нетрах, і
няма таго, што раньш…
І толькі надпіс “Плошча Незалежнасьці”
паўзьверх надпісу “Плошча Леніна”
даводзіць, што ён покуль яшчэ жывы.

***Касец газонаў***

Колісь людзі верылі,
што галоўная прылада сьмерці –
іржавая каса.
Потым – вынайшлі газонакасілку.

І цяпер старой прасьцей
касіць сваю канюшыну,
зграбаючы залаты мурог
у ахайныя стагі ды копы.
(Зрэшты, паліцыя тут ні пры чым,
проста трагічны зьбег абставінаў.)

Адзін дасьціпнік напісаў,
што для коней і закаханых
сена пахне па-рознаму.
Ён дакладна ведаў,
што працаголікі з касілкай
прыходзяць да ўсіх.

У юнацтве я аднойчы
доўга назіраў за адным такім
па дарозе ў ваенкамат.
Да мэты заставалася крокаў дзьвесьце
і сьпяшацца ой як не хацелася,
а тут якраз гэты сівенькі хрэн
са сваёй баявой машынай.

На галаве навушнікі плэера.
Рухаецца ў такт музыкі,
якой, вядома ж, не чуваць.
Але, мабыць, нешта вельмі прасунутае,
бо надта ж энэргічныя рухі
і столькі ў іх свабоды,
што я нават на хвілінку
спалохаўся за газон.

Газон вытрымаў,
а я так і не дайшоў да ваенкамату,
дзякуй старому мэляману.

Пазьней я нават
хацеў набыць сабе газонакасілку,
але абмежаваўся плэерам.

Бо як яшчэ не прапусьціць
таго адказнага моманту,
калі пачуеш у навушніках
зь дзяцінства знаёмую песьню,
якая ніколі не састарэе:

*Ня плач, дзяўчынка,*
*пройдуць дажджы!*
*Вось канюшынка,*
*дапаможы!*

Калі адчуеш блізкую прысутнасьць
таго, хто ня кідае
позваў у паштовую скрыню
і ня звоніць уначы па тэлефоне
голасам копа-ўчастковага;

калі адчуеш водар
сьвежаскошанай травы
і зразумееш, што, нарэшце,
закасіў па-сапраўднаму.

KAMUNIKAT.org

* * *

Усё жыццё табе здаецца,
што ты займаеш чужое месца,
выгодна седзячы ў купэ ля акна,
а ў білеце пазначана месца
ля калідора.

Таму на кожнай станцыі
ты зьлёгку нэрвуесься, –
згоняць? ня згоняць? –
калі бабулька
спыняецца ля твайго купэ,
хвілінку думае,
а потым крочыць далей.

KAMUNIKAT.org

***Гадзіны гвалту***

Мая жонка магла б цешыцца.

Яшчэ ніводная чужая жанчына не згвалтавала мяне, абудзіўшы а раньняй гадзіне.

Усё болей мужыкі.

Не, я зусім ня гей, проста гэтыя гвалтаўнікі выкарыстоўваюць для сваіх мэтаў тэлефон.

Так, Сяргей П. хацеў атрымаць візу й тэлефанаваў мне на досьвітку, быццам я – літоўская амбасада.

Серж М. патрабаваў новага перакладу "Акерманскіх стэпаў" Міцкевіча, хоць і старыя няма каму чытаць. Асабліва – зранку.

А Андрэй А. – той проста зьдзекаваўся, абуджаючы пытаньнем: "Партайгеносэ! Як жыць далей?"

Быў яшчэ Эдуард А., што пазваніў а непрыстойна раньняй гадзіне, запрашаючы ўступіць у Саюз беларускіх пісьменьнікаў. Я быў настолькі сонны, што пагадзіўся...

Зрэшты, не – былі й тэлефонныя гвалтаўніцы-жанчыны: з пэрсаналу эўрапейскіх гатэляў.

Былі бэрлінскія фарбаваныя бляндынкі з гатэлю, бітма набітага працамі Эндзі Ўорхала, – і я ў жаху прачынаўся, бачачы над галавой зялёныя вусны Мэрылін Манро.

Была амстэрдамская мурынка, што абудзіла пасьля ночы, калі я так напаліўся травы, што паўгадзіны стаяў і ня мог перайсьці пустую дарогу, баючыся не ўхіліцца ад раптоўнай машыны з-за павароту.

Была прыўкрасная Караліна, міс гарнізоннага гатэлю на ўскраіне Варшавы, што абудзіла а пятай гадзіне ранку, запрашаючы паглядзець рэпартаж хакейнага матчу Беларусь – Канада зь

японскага Нагана. (Гэтая грукала ў дзьверы: які можа быць тэлефон у гарнізонным гатэлі на ўскраіне Варшавы?)

Найчасьцей былі мэханічныя галасы, віртуальныя аўтаматы, што гучалі абсалютна аднолькава ва ўсіх краінах і на ўсіх мовах.

Цікава, які голас і а якой гадзіне будзе, калі я засну мёртвым сном і нехта пазвоніць у мой гатэльны нумар на мінус першым паверсе?

KAMUNIKAT.org

***Лятэрэя***

“Білеты на заўтра! Білеты на заўтра!” –
заклікае прадавачка на выхадзе з мэтро,
а ты не ўрубаесься:
гэта як – “білеты на заўтра”?

Разумееш там, на канцэрт, на футбол…
Цікавае, мабыць, відовішча гэтае “заўтра”.

Альбо: на цягнік, на аўтобус…
Заўтра што – канец месяца,
і яны распрадаюць праезныя,
сапраўдныя адзін дзень?
А пазаўтра прыйдуць кантралёры і –
лепш бы ты купіў на футбол!

Так што, заяц, глядзі ў каляндар,
сачы, колькі жывеш бясплатна
і ці не пара набыць
адваяваны ў безьбілетнага нябыту
кавалак жыцьця –
сапраўднага
адзін дзень.

Вось так пачуеш нешта,
і ўрубісься, ня ўрубісься –
лятэрэя!

Большасьць мэтафараў сьвету –
рэклямныя сьлягалы,
у якія ты не ўрубіўся.

KAMUNIKAT.org

## *Чэмпіянат сьвету па акынскай паэзіі*

Гэты сьвет цудоўны,
бо хіба ж ня цуд –
прамовіць такую банальнасьць
і не памерці ад сораму!

А ты яшчэ як жывы,
хоць і крыху прысаромлены,
разгублены – ці то загублены? – у гэтым сьвеце.

Так, быццам ясі пэрсік
у найшыкоўнейшай залі рэнэсансавай вілы,
і загадзя турбуесься, думаючы,
куды выкінуць костку,
бо няможна ж тут хадзіць з косткаю ў руцэ,
а сьметніцы нідзе не відаць,
як раптам выяўляецца,
што косткі няма.

І ты, як стары дасьведчыны акын,
гатовы сьпяваць ад радасьці,
бо ўсе іншыя нечага шукаюць,
а ты ўжо знайшоў.

І ты расчыняеш акно,
як вялізарны ноўтбук,
высоўваесься па пояс –
і крычыш,
а потым захоплена слухаеш рэха,
быццам чакаеш,
покуль нехта чапляе
далучаныя файлы
да твайго пасланьня.

## *даверасьнёўская лірыка*

калі танкам
прэ натхненьне
калі твой штодзёньнік
ён жа нататнік
ён жа чарнавік
яшчэ не запоўнены на тры чвэрці
калі на палях тваёй пісаніны
першы месяц вясны
павольна перацякае ў другі

можна сьмела
рыфмаваць
“сакавік-красавік”
потым крэсьліць
пісаць нанова
словы
радкі
вершы
застанецца
кожны
чацьверты
і дзякуй

але вось ты даходзіш скажам да “17 верасьня”
спыняесься й мімаволі пачынаеш эканоміць старонкі
даўжэй думаеш каб потым давялося меней закрэсьліваць
імкнесься пісаць шчыльна каб як мага болей уціснуць у кожны дзень
і настальгічна згадваеш
сваю
даверасьнёўскую
лірыку

# II. Пераключаючы каналы

KAMUNIKAT.org

* * *

Чужая мова
лашчыць мне вуха,
як пірсінг
на чужым языку.

KAMUNIKAT.org

## Зь нізкі “Неба над Бэрлінам”

### *Гарачая пяцёрка бэрлінскіх навінаў*

Акно з выглядам
на птушыныя галасы –
спэцыяльна для сьляпых
і аматараў падазроных мэтафар.

Нямецкі паэт
з амэрыканскім прозьвішчам
цытуе Мандэльштама,
а ты працягваеш –
ужо ў іншым месцы
і таварыстве.

Помнік футбольнаму мячу,
як гол у Брандэнбурскую браму,
побач з разбураным Бэрлінскім мурам
выглядае, нібы напамін:
гэтыя футбалісты
прабіваюць любую сьценку.

Старэнькі будаўнік
у касцы й спэцвопратцы
папярэджвае,
што далей небясьпечна,
бо на галаву ў любы момант
можа плюхнуцца
чарговая зьліва.

І сонца пырскае пад нагамі,
і маленькія вясёлкі
люструюцца ў лужынах
і на другім паверсе
аўтобусных шыбаў,
і ты захлынаесься
водарам навальніцы
і не пасьпяваеш сушыць
парасону й шкарпэтак,
і мапы бэрлінскага мэтро,
што вывозіць цябе на паверхню
якраз пасярэдзіне гэтага радка.

KAMUNIKAT.org

***Драйв***

Тут магла быць халяўная рыфма “кайф”,
але наш *драйвэр* гаворыць прозаю.
Я разумею прыкладна трэцюю частку,
таму застаецца радыё.

У бэрлінскім FM-е цесна:
дваццаць чатыры гадзіны джазу
і дваццаць чатыры – клясыкі.

Моцарт добра адпавядае
рухам нашага кіроўцы.
Усё віртуозна
і па-нямецку дакладна,
нібы спэцыяльна прыдумана
для вялікага сляламу ў дарожным корку:
трапіў –
цяпер адкаркоўвай,
і ён адкаркоўвае
ў рэ міноры,
мажор!

Зусім іншае джаз.
Цябе ахоплівае паніка.
Табе здаецца, што Оскар Пітэрсан
грае апошні раз у жыцьці.
Прынамсі, тваім.
Бо кіроўца,
зачараваны чарговаю сынкопай,
вось-вось ня ўпішацца ў паварот,
і тады пачнецца сапраўдны джаз,
музыка для тоўстых рэаніматараў,
якія доўга ня змогуць сьцяміць,
што здарылася:
ці то дзьверцу заклініла,
ці то цябе заклініла,
ці ва ўсім вінаваты драйвэр,
каторы
у аўтамабільным заторы
дачакаўся свайго саторы.

## *Сухі закон*

“Пара па пабах!” –
гучыць немілагучна,
асабліва гэтае “па-па”,
нібы намякае на разьвітаньне,
а вечар яшчэ толькі пачынаецца.

З табой іранічны іранец,
крыху затурканы турак,
два расьсеяныя расейцы,
вугорац,
чарнагорац,
шатляндзкі горац
і твая сяброўка,
у якой сёньня сухі закон.

Некалі ва Ўкраіне
гасьцінныя гаспадары
спакавалі табе ў дарогу сухі паёк,
у які ўваходзіла пляшка гарэлкі,
пляшка віна
і, чамусь, палка кілбасы,
прычым нават кілбаса там не была сухой,
што ўжо казаць пра віно,
ружовае й дэсэртнае,
як салодкая мара.

Ваш аўтобус тады зламаўся
і тры гадзіны прастаяў у Бярдзічаве,
дзе кожная афіцыянтка ведае,
хто такі Джозэф Конрад
і дзе вянчаўся Бальзак.
Але ты вытрымаў
усе тосты за Эвэліну Ганскую
і “Вока цемры”,
хоць уваччу раз-пораз
згушчалася цемра,
і цябе хістала,
як верталёт пад музыку Вагнэра,
і ты разумеў,

што апакаліпсыс – менавіта сёньня.

Сёньня вы ў Бэрліне,
дзе дождж і немцы,
як напісала твая сяброўка,
у якой сухі закон;
хоць ты не губляеш надзеі,
што хутка ён зьменіцца паўсухім,
а калі пашанцуе, то й паўсалодкім.
Цябе ж адразу ахапіла гарачка,
белая й нефільтраваная,
жывая.

*Weissbier* –
трэці нямецкі выраз,
які ты навучыўся вымаўляць без памылак.
Раней былі “хендэ хох!” і “ніхт шысэн!”,
калі ты гуляў у вайнушку,
але маленькім партызанам не налівалі піва,
і вам заставалася адно пускаць пад адхон цягнікі.
Зрэшты, арганізатар “Літаратурнага Экспрэсу”
сёньня падазрона на цябе пазіраў.
Мо ў цябе яшчэ ўсё наперадзе?

З табой іранічны іранец,
крыху затурканы турак
і рэшта паэтаў.
Шкада, адсутнічае фін-інспэктар,
таму кожны сам за сябе.

Тваіх кішэнных
хапае роўна на шэсьць кухляў *Weissbier*
і адзін палітнекарэктны верш,
таксама белы і нефільтраваны.

*Прагноз надвор’я*

Едучы ў гатэльным ліфце,
дазнаесься шмат цікавага.
Не, не пра тое, ці шмат паверхаў,
гледзячы на кнопкі;
і не пра ўласнае сьвінства,
гледзячы ў люстэрка;
і нават не пра ход чэмпіянату Эўропы па футболе,
што фіксуецца ў адмысловай табліцы.

Гатэльны ліфт насамрэч –
маленькі філіял бэрлінскай абсэрваторыі,
і кожнага ранку
ты чытаеш апошнія зводкі
зь нямецкага атмасфэрнага фронту,
каб выйсьці ў горад
і на ўласнай скуры пераканацца,
што прагнозы – рэч няўдзячная,
а мокрая кашуля – бліжэй да цела.

Штось ня так,
штось ня так з гэтым небам,
ад якога не ратуюць
ні хованкі ў найбліжэйшай краме,
ні парасон, прынагодна куплены
ў гэтай краме,
ні алькаголь, прынагодна куплены
на радзіме.

Вядома ж, можна цэлы дзень
праседзець у гатэлі,
але й адтуль адкрываецца від
на бэрлінскае неба
зь яго перыстымі аблокамі,
кучавымі хмарамі
і пералётнымі анёламі
“Люфтганзы”.

І нават схаваўшыся
у Музэі кіно на Патсдамскім пляцы,
ты маеш усе шанцы
пабачыць найлепшыя кавалкі
неба над Бэрлінам.

### *Пайсьці і не вярнуцца*

Наступны прыпынак –
Блышыны рынак.

І ты лавіруеш паміж
прыпаркаванымі роварамі,
баючыся зачапіць,
каб не спрацавала сыгналізацыя,

покуль мэлёдыя ў навушніках
зьмешваецца з навакольнымі гукамі
ў вялікім і маленькім
крывабегу тваёй музыкі,
а твой унутраны экскурсавод
абвяшчае:
наступны прыпынак –
Блышыны рынак.

І мясцовы ляўша
паказвае табе ўмоўны знак:
ці то “перамога”,
ці то “хутчэй гані два эўра
за ўсё, чаго табе не хапала
для поўнага кайфу”:
- трохструнная гітара;
- дзіцячыя гальштукі;
- электраштопары;
- пампэрсы з рукавамі;
- граблі з масажнымі насадкамі;
- канькі для блізарукіх;
- супрацьтанкавыя галёшы;
- сьветлафоры для дому;
- насьценны тостэр зь зязюляй;
- швайцарскі гадзіньнік з выкідным лязом;
- друкавальная машынка “Зынгер”,
    пяць пар нагавіцаў пад капірку;
- пляшка патэфоннай гарэлкі,
    78 абаротаў за хвіліну;
- парнаграфічныя карты
    сакрэтных аэрадромаў…

І ты ўжо блізкі да стану,
калі трамваі спыняюцца
проста ля дзьвярэй тваёй сьвядомасьці
і вязуць на другі паверх.

Кола замкнулася.
Выйсьця няма.
Наступны прыпынак –
Блышыны рынак.

KAMUNIKAT.org

## *Унтэр дэн Ліндэн*

*Васілю Сёмуху*

Ліпа цьвіла першы дзень.
Цікава, што сказаў бы на гэта клясык?
Пагатоў, суседнія ліпы цьвілі таксама.
Усе бяз вынятку.
Менавіта ў іхных шатах і пачаўся ліпень,
а календар адно засьведчыў – 1.07.

Першага ліпеня я апынуўся
пад ліпамі на аднайменнай вуліцы –
і адразу ж натрапіў на квартэт.
Так, слова гонару, ніякіх баек.
Вядома ж, людзі.
Усе чатыры акардэаністы
зь фірмовымі “Вэльтмайстарамі”.
(Я бачыў такія ў Музэі музычных інструмэнтаў.)
Усе ў шэрых гальштуках і мэлянхалічным настроі.
Усе ў шэраг на адной лавачцы,
хоць, як тут ні сядай, відаць, што прафэсіяналы.

Але ж ня граюць. Ці то адпачываюць,
ці то й не зьбіраліся граць,
пасаджаныя тут зь нейкай іншаю мэтай –
відаць, аздабляць і без таго шыкоўны краявід.
Чатыры рарытэтныя акардэоны –
і так досыць, і так клёва, чаго ж табе яшчэ?
З музыкай быў бы перабор
і нэрвы проста ня вытрымалі б.
Як і песень салаўя,
што не патрабуе беларускага перакладу,
колькі ні сьвішчы “цёх-цёх-цёх-цёх!”
замест арыгінальнага “тандарадэй!”

Не хапала тут толькі мілоснай песьні,
*love story* васьмісотгадовай даўніны,
калі хлопцы й дзяўчаткі і блізка ня чулі
пра сэксуальную рэвалюцыю,
але пасьпяхова зьдзяйсьнялі злачынствы,

адзінымі сьведкамі якіх
заставаліся нямецкія нахтыгалі!
Вось толькі паказаньняў іхных
не зразумеў бы ніводны суд,
хоць “цёх-цёх-цёх-цёх!” скажы,
хоць “тандарадэй!”

Мая чачэрская бабуля
не чытала Вальтэра фон дэр Фагельвайдэ,
але штолета выпраўляла мяне пад ліпы
зьбіраць квецень на ліпавую гарбату.
І я караскаўся на дрэвы
і набіваў пакеты зялёнаю панацэяй,
не шкадуючы ні натхненьня, ні часу.
Зрэшты, ня толькі на гэта.
Дый чаго шкадаваць,
калі губляючы, толькі набываеш,
калі даўно змоўк апошні акардэон,
а ўвушшу гудзе “цёх-цёх-цёх-цёх!”,
зразумелае безь перакладу.

І цяпер згадваю
усё, што некалі сарваў, спакаваў і засушыў,
і зноў не шкада страчанага часу,
бо такі знайшоў, –
і квецень на Унтэр дэн Ліндэн
нагадвае ня толькі смак даўномінулай гарбаты.
Вось яно, простае чалавечае шчасьце,
і хай толькі хто-небудзь,
хай толькі які подзеўбень
паспрабуе назваць яго ліпавым!

## *Пераключаючы каналы*

Каналаў у Амстэрдаме
нашмат болей,
чым на тэлебачаньні.

Ні па адным з апошніх,
што вельмі дзіўна,
не ідзе порна;
па адным зь першых,
што яшчэ дзіўней,
ідзе ваш карабель інтэлектуалаў.
(Відаць, прыказка памыляецца,
і шанцуе ня толькі дурням.)

Вы, мабыць, тут адзіныя,
хто ня езьдзіць на роварах,
якіх навокал столькі,
што, здаецца, у горадзе
спынілася вэлягонка.
Вось толькі жоўтая майка лідэра
крыху замільгала й згубілася
у вечаровым сьвятле
чырвоных ліхтароў.

Толькі тут ты нарэшце паверыў
у пачэсны абавязак
сеяць разумнае, добрае, вечнае,
і таму ідзеш у кафэшоп,
каб абсалютна легальна
набыць для сяброў-музыкаў
канапляных зярнятак.

Нехта выдумаў
сумяшчаць гэтыя кафэшопы
з інтэрнэт-кавярнямі,
нібы наўмысна,
каб ты болей ніколі не казаў сабе,
пазнаўшы знаёмага
мярзотніка ў сеціве,
што гэтая сволач вярзе на форуме?

Ён што – абкурыўся?

Гандлёвец шчасьцем
не спыняецца на дасягнутым
і спрабуе ўпіхнуць табе
грам, а тое і ўсе тры
экалягічна чыстай радасьці,
і ты пагаджаесься,
і крыху пазьней разумееш,
як усё-ткі меў рацыю
наш клясык, напісаўшы:
“плылі сузор’і касякамі ў небе”.

І, як некалі маці
рабіла зарубкі,
вымяраючы твой рост,
ты таксама робіш пазногцем
пазнакі на касяку,
рэгіструючы рост
новых адчуваньняў.

Ты гатовы адчуць
нават водар дажджу
у суседняй краіне,
толькі ўва ўсёй Эўропе суха,
і табе застаецца рэагаваць
на каву,
жаночы парфюм
і кветкі.

Прадаўцы туліпанаў
сустракаюцца тут значна часьцей
за пакупнікоў,
але ты наіўна верыш,
што, нягледзячы на свабоднае каханьне,
масты каналаў тут
разводзяцца значна часьцей,
чым людзі.

***Commedia***

У якім коле
Дантавага Пекла
пакутуюць выпівохі,

што напярэдадні зьмешвалі
паўсалодкае віно зь півам
і не пасьпелі раскаяцца перад сьмерцю?

Якраз у гэтым коле
мы й прачнуліся зранку,
хоць фармальна вакол нас

была Польшча,
горад Wrocław
і гатэль Wodnik.

Веснавое сонейка крыху зьменшыла пакуты,
аднак ня выклікала жаданьня
размаўляць тэрцынамі.

Ранішняя кава перанесла нас у Лімб –
на правах рэдкіх паганцаў
(у сэнсе, найлепшых язычнікаў),

а можа, нават няхрышчаных немаўлятаў?
(Бачылі б вы інфантыльную фізіяномію
маладога паэта насупраць!)

Узыходжаньне ўгору па Дантавай лесьвіцы
працягвалася –
і вось мы ўжо ў гатэльным Чыстцы:

фінская саўна, басэйн,
тэлевізар, більярд –
і ўсё абсалютна бясплатна.

Хто ведае, як далёка ў Рай
мы перанесьліся б,
калі б ня скончыліся гатэльныя содні?

Пана з рэцэпцыі, што забраў нашыя ключы,
звалі Пятром;
але мы не зьвярнулі ўвагі

на яго бэджык, сядаючы ў таксоўку.

KAMUNIKAT.org

***Смачна есьці!***

Адзін польскі пончык
каштуе роўна адзін польскі злоты.
Таму я кожнае раніцы
не магу пазбыцца ўражаньня,
што пажыраю на сьняданак
нацыянальную валюту
Рэспублікі Польшча.

KAMUNIKAT.org

## *Чысьціня über alles*

Самалёт прызямляецца.
Ветлівая сьцюардэса праходзіць па салёне,
зьбіраючы ў пакет раскіданае сьмецьце.
На ўсякі выпадак накрываю кашуляй
любімую кніжку.

KAMUNIKAT.org

## *Полтэргайст*

Зранку рукі над лэптопам
трасуцца так,
што цыгарэта падае на падлогу
зь іншага краю стала.

Адкуль яна тут?
Ты ж ня паліш дзесяць гадоў.

Відавочна, полтэргайст.
Хто яшчэ мог за адну ноч
нанесьці сюды столькі пляшак зь віном,
спаражніць іх
і параскідаць у лазенцы?

І што робіць куртка
амаль не знаёмага табе музыкі
на тваім унітазе?

І чаму ложкаў у пакоі
стала ўтрая больш, чым было?
І што за людзі сьпяць на іх зранку?

І хто скраў з тваёй галавы
амаль гатовы прыўкрасны верш,
зь якім так радасна засыналася ўначы
у пятніцу трынаццатага?

А ў суботу чатырнаццатага
рукі над лэптопам трасуцца так,
што цыгарэта падае на падлогу
зь іншага краю стала.

***У гасьцях у казкі***

Як казачна сёньня на возеры!

Спартоўцы-весьляры сярод ветразьнікаў,
нібы брыдкія качаняты сярод лебедзяў,
рубяць вёсламі з пляча,
і вадзяныя шчэпкі лятуць ва ўсе бакі,

а васьмёра сапраўдных качанятаў
шыхтуюцца ў адну лінію і плывуць
зладжана, як экіпаж “васьмёркі”.

Пажылы трэнэр,
добры казачнік на маторнай лодцы,
разганяе іх, ні халеры ня цямячы
у мэтафарах.

Ля вады лаяцца два бамжы.
Вочы ў аднаго – як чайныя сподкі.
Другі проста дае першаму па чайніку.

Русалачка,
яшчэ няўпэўнена перабіраючы
народжанымі зь пены нагамі,
выходзіць на нудысцкі пляж –
і губляе дар мовы:

на дупе нудыста
тату Ганса-Хрысьціяна Андэрсана.

***Справаздача***

Нібы схіл пагорка
пад тваёй сьпінай,
падымаецца сьпінка пералётнага фатэля,
і цень самалёціка *EasyJet*
усё большае й большае,
і вось ты зноўку ў горадзе,
дзе так лёгка пішацца ад рукі;

дзе вулкі такія вузкія,
аўтобусы такія шырокія,
а асфальт такі шурпаты,
што нават едучы роварам на гару,
не адпускаеш ручнога тормаза

па дарозе на возера,
дзе ты плаваеш пры канцы верасьня,
і вада так прыемна халодзіць каленку,
разьбітую падчас апошняга падзеньня з ровара,
калі ты заслухаўся сьпеваў
прыдарожных цыкадаў,
якія потым доўга пераказваў
найбліжэйшай мэдсястры;

дзе ў кнайпе
з гаворачай назваю “Амнэзія”
ня трэба даплачваць
ні за імбірны сыроп да піва,
ні за ўсьмешкі дзяўчат насупраць,
калі палова піва з імбірным сыропам
апынаецца на тваім пузе;

дзе ўсе разумеюць усіх безь перакладніка,
і вы з маладою немкаю
разам слухаеце расійскіх клезмэраў,
што сьпяваюць на мове ідыш
песьню “День Победы”;

дзе ты можаш сядзець на траве
у прамым сэнсе слова,

і таварыскія мурашы
запаўзаюць ва ўсе найінтымнейшыя месцы,
але не кусаюць,
а ты па-пластунску перапаўзаеш
з адной сонечнай плямы на другую,
з пляшкай ёгурту
і кніжкай бітнікаў –
дзіўнае кампанія як на сярэдзіну дня,
але ты толькі што прачнуўся;

бо ў гэтым горадзе
начамі так доўга думаецца
пра ўсіх, каго ты згадаеш,
калі нарэшце ня вытрымаеш
усёй гэтай вечнай радасьці –
і скальпэль нябеснага кардыёляга
напіша “I” і “YOU”
з двух бакоў ад твайго сэрца.

KAMUNIKAT.org

### ***Поры году***

На пачату лістапада
Вівальдзі й Чайкоўскі
зноў перакуляцца ў труне,
калі беларускі памежнік
зойдзе ў купэ цягніка “Варшава-Менск”,
абвяшчаючы перавод гадзіньніка
на летні час.

KAMUNIKAT.org

**Зь нізкі “Аб кавярнях менскіх праўда”**

***Двухпавярховая краіна***

Кавярня “Лёндан” – двухпавярховы омнібус,
на другі паверх якога
доўгі час не пускалі пасажырак –
дзеля высокай ангельскай маралі.
(Хто ведае, што бачаць зьнізу юнакі?)
Спэцыяльная служба нават адказвала за тое,
каб не прапускаць ніводнай спадніцы.

Таму, заходзячы сюды,
ты мімаволі касавурысься на сяброўку,
але ўсё ОК, спадніцы яна не надзела –
на ёй нагавіцы
рэвалюцыйнага колеру й прызначэньня.

Але другі паверх вам усё адно ня сьвеціць,
бо месцы для пасажыраў зь дзецьмі –
унізе, а вышэй п’юць ня толькі гарбату.
(Хто ведае, што бачаць зьверху дарослыя?)

Трындзёж у кавярні –
не найгоршы з тваіх твораў,
кніга, якую ты гатовы пісаць у любы дзень,
без выходных і выходных дадзеных,
у атачэньні папяровых кніжак на паліцах,
чые аўтары трындзелі й дагэтуль трындзяць
у іншых кавярнях.

Неяк знайшоўшы на гэтых паліцах
і сваю кніжку вершаў,
ты амаль заганарыўся,
але кніжка сваечасова зьнікла…
Хутка ты суцешыўся,
падумаўшы, што яе скраў
нейкі шанавальнік літаратуры,
а вось кнігі тваіх калег стаяць дагэтуль.

Дарэчы, пра коўдры.

Іх вам прапануюць толькі тут,
ды яшчэ ў "Старым Менску",
які – насуперак геаграфіі –
знаходзіцца ўсяго ў пары соцень мэтраў адсюль.

Так што халодным вечарам,
не знайшоўшы вольнага месца на радзіме,
ты заўсёды можаш эміграваць
на тэрыторыю,
дзе ня мае сэнсу зьмена гадзінаў,
зрабіўшыся пасажырам двухпавярховай краіны,
дзе заўсёды час піць гарбату.

KAMUNIKAT.org

## ***Дзьве гадзіны ў рэзэрвуары***

У кавярні “Акварыюм”
да халеры беларускіх інтэлектуалаў.
Прыходзіць у “Акварыюм”
са сваім беларускім інтэлектуалам –
усё адно што ехаць у Тулу
са сваім самаварам
альбо, скажам, даваць на гарбату
афіцыянткам у “Лёндане”,
дзе гэтай гарбаты і так хоць заліся.

Інтэлектуалы прыходзяць сюды як на працу.
Часам завітваюць зранку –
і сядзяць, сядзяць: хто на самоце,
сарамліва спажываючы мукі творчасьці,
недаступныя простым сьмяротным;
хто па двое, даючы адно аднаму інтэрвію
(пасьля, як на трэніроўцы па адзінаборствах,
актыўны й пасыўны партнэр мяняюцца месцамі);
хто па трое – такі сабе атрад інтэлектуалаў са здраднікам,
які не вытрымлівае да канца тостаў,
а таму раней за ўсіх трапляе ў кантэкст.

Ім добра гамоніцца разам:
беларускі паэт нешта дэклямуе,
дэманстратыўна якаючы,
госьць з Украіны натуральна *і*кае,
здраднік натуральна ік*а*е.

Навокал вялікая прадуктовая крама
і проста прахадны двор
з мэтро ў “Макдональдз”,
а яны, адгароджаныя шклом,
не купляюць ані гамбургераў,
ані “крувасанаў”
(тэрміналёгія мясцовых прадавачак),
не стаяць у чарзе ў бясплатную прыбіральню –
сядзяць.

Яны – прафэсійныя беларускія інтэлектуалы,

узорна-паказальныя экспанаты,
выстаўленыя ў вітрыне,
акварыюмныя істоты,
ну чым вам не залатыя рыбкі,
хіба што не выконваюць жаданьняў
навакольных менчукоў і гасьцёў сталіцы.

Стаміўшыся ад ударнай працы, яны засынаюць –
проста за сваімі працоўнымі столікамі.
Магчыма, ім сьняцца
красуні з плаўнікамі й жабрамі,
што лена дрэйфуюць у чатырох шкляных сьценках,
а ў снах бачаць сябе
беларускімі інтэлектуаламі
з кавярні “Акварыюм”.

KAMUNIKAT.org

***Ад смагі паміраю ў “Экс-Крыніцы”***

*А магчыма, проста піва*
*Прагнуў выпіць насупроць*
*Камітэту дзяржбясьпекі...*
У. Арлоў

Аднойчы ў Сярэднія Вякі
ў адным шыкоўным замку на Люары
перасохла крыніца.
Вось было радасьці паэтам,
што апявалі сваю смагу ў балядах
і нават зрабілі з гэтага спаборніцтва.
Тры з гэтых балядаў я нават чытаў:
адна, як водзіцца, належала спонсару імпрэзы,
другая – паэту-злачынцу,
імя трэцяга вечна забываю.

Сёньня я пачуваюся
болей злачынцам, чым паэтам:
накладае свой адбітак суседзтва
з камітэтам дзяржаўнай бясьпекі,
чый вялізарны гмах
проста навісае над нашымі кухлямі
на другім паверсе кавярні
з падазронай назваю “Экс-Крыніца”.

Сёньняшні напой
таксама мог бы называцца “Экс-Крыніца”,
бо слабаалькагольны трунак,
абвешчаны ў мэню,
яўна разбавілі чымсьці мацнейшым,
і я выглядаю Танталам,
што пакутуе па горла ў гарэлцы
і прагне звычайнага піва.

Мудрыя людзі кажуць:
“калі ў цябе манія перасьледу,
гэта яшчэ ня значыць,
што за табою ня сочаць”.
Але з кожным глытком і кухлем

злачынцы ўва мне застаецца ўсё меней,
а паэта ўсё болей…

Вось толькі хто,
таварыш маёр,
спатоліць нашу смагу,
ад якой мы паміраем
над маленькім столікам,
на другім паверсе,
“насупроць камітэту дзяржбясьпекі”?
Мы – гэта, як водзіцца, спонсар імпрэзы,
паэт-злачынца…
Трэцім будзеш?

KAMUNIKAT.org

# III. Успомніць усё

KAMUNIKAT.org

***Чэмпіянат Эўропы***

З кім толькі
ні параўноўвалі Эўропу,
дзяўчынку-каўбоя,
што ўседзела на бычынай сьпіне
максымальна доўга,
аж да самага канца радэа.

Я нейк назваў яе пясочніцаю,
куды не пускаюць беларускіх дзетак
іх нацыянальна непрасунутыя бацькі.
Сёй-той абразіўся параўнаньнем,
хоць, мяркую,
каўбоям і матадорам спадабалася б.

Але я тады думаў
не пра пясочную арэну
палітычнай карыды,
а пра досыць нявінныя дзіцячыя забавы
з саўком
(я пра маленькую рыдлёўку),
плястмасавым самазвалам
ды алавянымі жаўнерыкамі,
калі кожны з нас быў генэралам,
які толькі пачынаў сваю
пяшчаную кар'еру.

Што да дзяўчатак, то яны
пераважна рабілі "сакрэты",
выкопваючы ў пяску ямінкі
і аздабляючы гэтыя дамавінкі
жывымі кветкамі
і (нежывымі) паперкамі ад цукерак і жуек.
Галоўнай часткаю інсталяцыі
быў каляровы кавалачак шкла,
што клаўся паўзьверх –
і атрымлівалася *красиво*;
потым "сакрэт" закопваўся,
старанна хаваўся, але так,
каб лёгка было знайсьці,

асабліва іншым.

Толькі праз шмат гадоў я зразумеў,
што гэта былі правобразы
нашых будучых інтэрнэт-сайтаў,
вершаў і порназдымкаў,
што мятлікамі ляцяць на сьвятло
і заблытваюцца ў сусьветнай павуціне,
у душы прагнучы
зьвярнуць на сябе хоць якую ўвагу,
ды ўпарта хаваючы
свае сумнеўныя “сакрэты”,
нібы тая Эўропа,
чэмпіёнка радэа,
старая панна,
што так і ня зьлезла з бычынае сьпіны
для чаго іншага.

KAMUNIKAT.org

***Жаночы футбол***

Нападніца Тацяна
атрымлівае пас,
праходзіць па флянгу,
набліжаецца да брамы
і прабівае –
на жаль, недакладна:
пераляцеўшы ўяўную трыбуну
нябачнага стадыёну,
мяч апускаецца
на водную паверхню
і плыве за плыняй
у пошуках лепшай долі...

Сем футаў пад болам, Таня!

### *Біятлён*

Бітма набіты агульны вагон
сыпяшаўся за лякаматывам,
быццам караван біятляністаў
за лідэрам у зялёных штанах.

“Глядзі, мы абагналі сьветлафор”, –
узрадаваўся дзіцячы голас.
Ніхто не спрачаўся,
бо мы й напраўду набралі хуткасьць,
пакідаючы стадыён.

Папсовая музыка з дынамікаў
падбадзёрвала,
як галасы трэнэраў.

Дрэвы мільгалі за вокнамі,
як засьнежаныя
скадынаўскія заўзятары.

Сёй-той загадзя
рыхтаваўся да прыпынку,
папраўляючы заплечнік,
нібы вінтоўку за сьпінай.

А ты глядзела праз акно
на галінкі ў карунках шэрані,
а пасьля рамантычна прамовіла:
“Які сьнег!
Як там цяпер добра!
Зусім як учора ў Обэрхофе,
па тэлевізары”.

Я падумаў, што так, цяпер добра.
У Обэрхофе.
У тэлевізары.
Учора.

KAMUNIKAT.org

### *Вэлягонка пратэсту*

Паліцэйскія мігалкі
даюць першы залп у вочы,
а далей
кароткімі чэргамі
бліскаюць сьпіцы ровараў.

У горадзе вэлягонка пратэсту.

Тысячы колаў.
Джэм-сэйшн кляксонаў.
Заплечнікі танчаць у такт.

Хто сядзіць у сядле,
хто, лежачы,
рушыць нагамі наперад.
(Так, мабыць, выгодней.)
Хто з прычэпам –
вэлякалыскай
для пратэстуючых немаўлят.

Дык супраць чаго?..
Не даюць адказу.

Апошні ровар.
Кантрольны сонечны блік
на сьпіцах.

Але ты адчуваеш
дзіўную салідарнасьць,
нібы нарадзіўся
у вэляпрычэпе,
а потым падрос,
перасеў на ровар,
адкінуў трэцяе кола,
адчуў між нагамі раму,
наладзіў кляксон ва ўнісон –
і ўплёўся ў хвост каравану
й пляцесься ў гэтым хвасьце,
і некалі выб'есься ў лідэры,
так і не зразумеўшы,
супраць чаго пратэстуеш.

***Валасы-2006***

ціхі анёл праляцеў
над гняздом зязюлі

яшчэ адзінаццаць тысяч
тваіх маладых суайчыньнікаў
за цэлы год
не пагядзяць ніводнага фільма
Мілаша Формана

KAMUNIKAT.org

***Успомніць усё***

Часам мне здаецца,
што я дасканала памятаю
усё, чаго памятаць аніяк не павінен, –
асабліва калі ўмыкаю TV.

Добра памятаю сваё нараджэньне
і першыя месяцы пасьля,
першыя прагулянкі ў вазочку
абсалютна пустымі вуліцамі гораду,
бо ўсе яго насельнікі якраз глядзелі,
як савецкі выведнік Шцірліц
усё крочыць і крочыць па калідоры
ў кірунку да непрыстойных анэкдотаў
ды іншых адзнак несьмяротнасьці.

Памятаю яшчэ колькіх выведнікаў:
трох агентаў 007,
адзін зь якіх пасьля зробіцца горцам,
а другі будзе доўга зьдзекавацца
зь беднай дзяўчыны-беспасажніцы,
але яна яго ўсё роўна акруціць,
і не ўратуюць ніякія навыкі
ангельскай каралеўскай выведкі.

Памятаю таксама
відэасалёны канца 80-х,
дзе з маленькага экрану,
гіпнатызуючы падлеткаў,
рыжая рыбачка Соня
зь вялікім мечам
тлумачыць яшчэ маладому Шварцэнэгеру,
што, маўляў, усе вас ведаюць,
Містэр Сусьвет,
а я дык бачу ўпершыню.

Памятаю нямецкую дзіцячую перадачу
з падазроным назовам
“Рабі з намі, рабі як мы, рабі лепш за нас!”
(Націск у слове “рабі”, як ні дзіўна,

падаў на другі склад.)

Порна пра грэцкую смакоўніцу
не памятаю,
бо замест яго
быў балет "Лебядзінае возера" –
па ўсіх каналах...

Вось і цяпер
уключаю вечаровыя навіны –
і адразу згадваю,
хто там ідзе,
хто сьмяецца апошнім,
хто вінаваты,
хто самае слабое зьвяно
і хто падставіў вясёлага Роджэра.

Людзі добрыя!
Калі ў мяне напраўду
пачнуцца праблемы з памяцьцю,
калі ласка, умыкнеце
першы канал
нацыянальнага тэлебачаньня!

KAMUNIKAT.org

## *Ачысткі сумленьня*

Чаго толькі ні зробіш для
ачысткі сумленьня!

Штодня сядаеш на кухні
перад тэлевізарам,
падсоўваеш плястыкавую сьметніцу
і – чысьціш, чысьціш яго,
абіраеш, як маладую бульбіну.

Ня дзіва, што яно
выглядае ўсё такім жа
сьвежым, апэтытным
і зноў гатовым да ўжываньня,
а калі ўважліва прыгледзецца –
усё меншае ў дыямэтры.

Але хто стане вымяраць
чужы дыямэтар?

Галоўнае – своечасова
выцягнуць са сьметніцы
пакет з ачысткамі
і выкінуць у сьмецьцеправод.

KAMUNIKAT.org

***Адносная вільготнасьць***

Калі галоўны паэт тваёй краіны
заканчвае сваю чарговую вялікую імправізацыю
на ўсіх каналах тэлебачаньня,
у тэлескрыні раптам зьяўляецца маленькі клоўн.
Ён мае сьмешны саламяны капялюш,
вялікія сялянскія вусы,
дурацкія саладжавыя інтанацыі ў голасе
дый іншыя адзнакі фальклёрнага жыхара рэзэрвацыі.
Каб давяршыць камічны эфэкт,
клоўн пераходзіць на тваю мову:
“А зараз, шаноўныя тэлегледачы,
давольце пазнаёміць вас з прагнозам надвор’я.
Заўтра чакаецца пераменлівая воблачнасьць,
вецер паўночна-заходні, памяркоўны,
ціск столькі й столькі мілімэтраў іртутнага слупка...”
Калі клоўн даходзіць “да адноснай вільготнасьці”,
мільёны жанчын тваёй краіны,
што яшчэ ня цалкам адышлі ад выступу паэта,
ізноў ажыўляюцца. Яшчэ б, некаторыя зь іх
усё яшчэ вільготныя, а ў некаторых
проста паблісквають вочы ад расчуленых сьлёз;
ёсьць і тыя, чые вочы сухія,
да таго ж палаюць стрымананым гневам;
самыя злачынныя пачынаюць рагатаць,
як рагаталі й пяць хвілін таму.
Тады ў выглядзе клоўна
праступае нешта эйнштэйнаўскае:
хто-хто, а супрацоўнік дзяржгідрамэтцэнтру
цудоўна ведае, што вільготнасьць –
штука адносная...

## *Прэзумпцыя невінаватасьці*

Кожны чалавек – невінаваты,
покуль адназначна не даведзены
факт ягонай віны.
Нават калі яна здаецца нам стопудовай,
ён яшчэ мае шанец на апраўданьне.

Узяць, на прыклад, мяне. Я сёньня
ледзь не асудзіў абсалютна нявіннага чалавека.

Стаю я каля супэрмаркету “Эўрапейскі”
і бачу, як нейкі мужык рухаецца
у бок жалезнага плоту. Відавочна,
каб зьдзейсьніць пэўны ўчынак, – думаю я. –
Учынак далёка не эўрапейскі.
Ну, так і ёсьць. Спыняецца ля самага плоту.
Шырэй рассоўвае ногі.
І застывае нерухомы. Праходзіць
дзесяць, дваццаць, трыццаць сэкунд.
Вось гад, – думаю я, – і не саромеецца
у самым людным месцы,
сярод белага дня.

Праходзіць хвіліна.
Да мяне далятае лязгат мэталу.
Ну, так і ёсьць. Бразгат ключэй.
У плоце ёсьць фортка, якой я не заўважыў.
Мужык проста адчыняе замок.
А я шэсьцьдзясят сэкунд псаваў сабе карму
дрэннымі думкамі, дурань.

Вось жа, кожны чалавек – невінаваты!
Покуль адназначна не даведзены
факт ягонай віны.
Нават мае землякі-беларусы.
Нават іх прэзыдэнт.

Можа, яшчэ апраўдаецца, – думаю я, –
і лічу сэкунды й гады.
Можа, проста адчыняе фортку.
Скажам, чарговае акно ў Эўропу,
дзе ёсьць Эўразьвяз,
Гаага й міжнародны трыбунал
з прафэсійнымі адвакатамі.

***Underground***

1.
“На станцыі «Кастрычніцкая»
цягнік не спыняецца”, –
паведамляе дынамік у вагоне.

Пасажыры ціхенька перагаворваюцца:
што адбываецца?
можа, нейкія непаладкі на станцыі?
ці ня здарылася чаго сур’ёзнага?

“Не, гэта апазыцыя!” –
супакойвае ўсіх п’яны пралетар.

Купка моладзі хутка ўстае
і выходзіць на станцыі
«Плошча Перамогі».

2.
Званю з мэтро сябру.
“Ты вольны?” – пытаецца ён.
“Так, – кажу, –
маю паўтары гадзіны да лекцыі”.

“Ды не, – кажа, – ты вольны?”
І тут да мяне даходзіць.
“Так, дзякуй!
Покуль што вольны”.

За чатыры дні звыклыя словы
зьмянілі свой сэнс.

3.
Вяртаючыся пасьля выкладу
на пляц,
я магу проста
перайсьці праспэкт –
і вось ён, пляц!

Але я сядаю ў мэтро,

праяжджаю станцыю,
выходжу,
і вяртаюся назад ужо аўтобусам.

Найкарацейшая дарога, –
казаў адзін сталкер, –
не заўсёды наўпрост.

4.
На ўваходзе ў мэтро
дзядуля прадае
цёплыя шкарпэткі.

Лаўлю яго позірк
і як мага прыязьней
усьміхаюся.
Ён усьміхаецца ў адказ.

Спускаюся ў мэтро,
потым спыняюся й паварочваюся.
Дзядуля ўсё яшчэ глядзіць
мне наўздагон.

*19-22 сакавіка 2006*

KAMUNIKAT.org

## ***Вершы пра Н. Н.***

Адразу за дзьвярыма – туман,
пагроза стабільнасьці нашай бацькаўшчыны.
Мяркуйце самі, колькі грошай убухалі
у пабудову новай бібліятэкі,
колькі студэнтаў гарбаціліся на суботніках,
колькі электраэнэргіі штовечар ідзе
на яе падсьветку рознакаляровымі агеньчыкамі...
А спусьціўся туман – і не відаць ні халеры!

Ну і што цяпер паказваць Алене Хадановіч,
што расьсякае ў патрыманым вазочку
па мікраараёне Ўсход?

Іншая рэч – газэта “Наша Ніва”:
васямнаццаць тысяч рублёў на тры месяцы –
і ў любое надвор’е, у самы жахлівы туман,
шточацьвер званок у дамафоне.
Не, Аленка, гэта не бабуля,
ты толькі глянь, што гэта нам прынесьлі.
І Алена Андрэеўна паўзе па тваіх каленях,
падбіраецца да стала і ўважліва разглядае
фоткі й літары на паперы, круціць галавою,
то левым вокам зірне, то правым,
то схопіць за галаў вядомага палітаглядальніка,
то адарве кавалак ад літаратурнага крытыка.
Што ты, Алька, ён жа татку Нобэля абяцаў!
Толькі пасьпявай адсоўваць – ніякай літасьці
ні жартам, ні прыватным абвесткам,
ні кінарэцэнзіям, ні шахматным этудам,
ні нават калёнцы галоўнага рэдактара!

Хвіліна няўвагі – і рука дацягнулася
да партрэта вядомага палітыка!
“Так яму, так!” – радуюцца бацькі.
Дзіця зрабіла свой выбар.
Дзіця наагул расьце – і ўмее ўсё болей і болей.
Хай толькі нам прынясуць новую газэту!
Хай толькі настане чарговы чацьвер
і распаўсюднік вынырне з туману,
націскаючы на дамафон!

***Вершы пра Н. Б.***

1.

Зранку, вызірнуўшы ў акно,
абавязкова ўбачыш землякоў.
Яны выпаўзаюць на вуліцу
паасобку й невялічкімі купкамі.
Самыя дысцыплінаваныя – зь вялікімі торбамі.
Торбы набітыя шкляным посудам.
Посуд яны аднясуць у пункт прыёму шклатары.
Нешта паб'ецца па дарозе.
Нешта ня прымуць.
Але большасьць пляшак і далей будзе ўдзельнічаць
у кругазвароце бырла ў прыродзе:
пляшка – зямляк – пункт прыёму – новая пляшка – новы зямляк…

А раней землякі
яшчэ насілі ў пункты прыёму
макулятуру,
і ўзамен атрымлівалі новыя кніжкі.
Цяпер – не, і ўсю макулятуру
перавозяць вялікімі грузавікамі
са старой Ленінскай бібліятэкі
у новую, Нацыянальную.
І, што цікава, нічога –
ну абсалютна нічога! –
не вязуць адтуль узамен.
Ці азначае гэта,
што кніжак у бібліятэцы робіцца ўсё болей,
нашмат болей, чым пляшак?

2.

Вось усе гавораць: "Бібліятэка, бібліятэка",
а я ўсё ніяк не магу туды трапіць,
колькі разоў ішоў у бібліятэку,
а апынаўся на Маскоўскім аўтавакзале.

Іх наўмысна пабудавалі
насупраць адно аднаго і блізютка-блізютка,

каб жыхары Шаркаўшчыны,
Падсьвільля
і нават глыбокага Глыбокага,
даехаўшы да Менску,
адразу траплялі ў Нацыянальную бібліятэку.
(Дый навошта яшчэ ехаць у Менск
з Шаркаўшчыны,
Падсьвільля
і глыбокага Глыбокага?)

З часам іх нават спалучаць надзейнымі
падземнымі й надземнымі пераходамі,
каб кожны чытач атрымліваў сваю кніжку
проста на аўтобуснай пляцоўцы.
Уявіце сабе:
– На восьмую плятформу
падаецца дадатковы маршрут
“Сто гадоў адзіноты” цераз Маконда.
– Празь пяць хвілін зь 17-й плятформы
адпраўляецца аўтобус у кірунку Свана
з усімі прыпынкамі.
Кошт білета 99 франкаў
па курсе Нацбанка РБ.
– Аўтобус “Бадзягі Дхармы”
пралятае над гняздом зязюлі,
канцавы прыпынак над прорвай у жыце.

І сад аўтобусных сьцяжынак
разыходзіцца па ўсёй маёй радзіме:
Шаркаўшчына,
Падсьвільле,
Глыбокае –
і далей! далей! далей!

## ***Камары думаюць пра Беларусь***

*Ігару Бабкову, таварышу ў няшчасьці*

Калі Пан Бог
у першыя шэсьць дзён тварэньня
стварыў бы й камароў,
мабыць, у сёмы
Ён бы ўжо нармальна не адпачыў.

І праўда,
якая тут міласэрнасьць
і любоў да ворагаў
нашых меншых,
калі цябе кусаюць
у правую шчаку,
а ты рэфлекторна
пляскаеш і па левай?!

...Паход у лясы
пачаўся з выправы
на Камароўку,
і гэта было знакам,
якога, на жаль,
ніхто не расчытаў.

Недаацанілі мы й першых налётаў,
не абвесьціўшы ўчасна
паветранае трывогі.

А потым пачаўся Пэрл-Харбар,
бязьлітасны й бессэнсоўны,
як усякі бунт
супраць Вялікага Брата,
які хоць і бачыць цябе,
але ж ніяк не пасьпявае
са сваёю груваcткаю
супрацьпаветранай абаронай,
бо адзіны ў атрадзе “зэнітчык”
узброены толькі фотаапаратам.

“Мабыць, хутка ўжо канец сьвету”, –
казалі ў роспачы пэсымісты,
а хтось асабліва цынічны дадаў:
“Ня мы, дык нашыя дзеці
дачакаюцца!”
І не было ў гэтым вялікага перабольшаньня.

Бо нашыя продкі вучылі
не рабіць з камара вала,
а мы й не рабілі,
іначай проста
не дажылі б да сьвітаньня.

Побач курылася вогнішча,
а ты падскокваў, нібы кенгуру,
і размахваў рукамі, як вятрак,
калі цэлае воінства
абкураных рыцараў
ідзе на яго сьвіньнёю…

Ды ўрэшце настае пара,
калі бярэш пару пляшак
і на пару хвілінаў
забываеш пра іхнае існаваньне,
альбо нават думаеш,
што чарговая атака
такі захлынулася ў тваёй крыві,
і верыш – вось яна, перамога,
і на поўныя грудзі крычыш:
“Жыве Беларусь!”
І чуеш у адказ радаснае
“З-з-з-з-зыве!”

# IV. Апошняе мэтро

KAMUNIKAT.org

***Азёрная школа паэзіі***

І было возера,
канцавы прыпынак гарадзкой чыгункі.

І было неба,
канцавы прыпынак яго легкадумных мрояў,
шэсьць дзён падарожжа праз дождж.

І было сонца на сёмы дзень.
І пабачыў ён,
што шэсьць папярэдніх было горай.

І былі ветразі,
параходы й буйкі
з папярэджаньнем “не заплываць”.

І было іх двое на цэлым сьвеце,
калі не лічыць вадаплаўных –
чаек і весьляроў-акадэмістаў.

І была яна топлес,
у модных шортах,
зь яблыкам у кішэні,
які выпіраў збоку,
нібы мячык у тэнісісткі,
што рыхтуецца да першай падачы...

Другой падачы не спатрэбілася.

KAMUNIKAT.org

***Любоўная вайна***

*Як ножкі цыркуля…*
Джон Дон

Крэсьлім новыя межы,
пажыраем чужыя тэрыторыі.

І я ўжо захапіў
палову сушы,
і ты ўжо захапіла
палову сушы.

А няўмелыя рукі
ўсё не навучацца трымаць
сваёй зброі.

Як ножкі двух цыркуляў,
пераплятаюцца твае і мае
драўляныя палачкі.

KAMUNIKAT.org

***Постымпрэсіянізм***

Дзіцём
спрабую забрацца на бабуліну печ –
і рукі па самыя плечы
патанаюць у чорным моры
семак,
якое бабуля спрабуе высушыць.

Таго часу
семкі сохлі на дзіва хутка,
а сяброўкі
не саромеліся іх лузгаць
пры мне,
і шалупіньне проста
вісела ў іх на вуснах,
зусім не забіваючы
жаданьня цалавацца.

І я здымаў яго –
асьцярожна, як сапёр,
бо першы дотык
запраста мог быць апошнім,
а так хацелася працягу,
пагатоў на печы
высыхалі новыя семкі.

З таго часу
я знаюся на сланечніках
ня горш ад Ван Гога,
а на гарбузах
нашмат лепш за яго.

KAMUNIKAT.org

### *Оптыка*

З раніцы мыю вочы,
забыўшы зьняць акуляры,
якіх зусім не адчуваў
у сьне,
апроч адной хвіліны –

калі ты ўжо зьняла
бікіні
і яшчэ не надзела
звычайнага станіка,

а я ўжо зьняў
цёмныя акуляры
і яшчэ не надзеў
звычайных –

для ніцавокіх лунатыкаў,
што адлюстроўваюцца
у сваіх шкельцах,
як у люстэрку
задняга агляду,
а таму ня могуць
падглядаць за табой.

І ты трымала мяне за руку,
пераключаючы сны
і не даючы мне
выпадаць на паваротах.

А пасьля
перавысіла хуткасьць
і адчыніла дзьверку,
і я валіўся
зь легкавіка твайго сну –

у адных акулярах,
дзе яшчэ не астыла
тваё апошняе
адлюстраваньне.

KAMUNIKAT.org

***Пра твае і мае майткі***

Хто сказаў, што нельга корпацца
у чужой бялізьне?
Няпраўда!
Калі вельмі хочацца, можна.
Напрыклад, у маёй.
Альбо ў нашай, калі ты ня супраць.

А што, пакажам ім нашу бялізну!
Апавядзем інтымныя прыгоды
нашых майткоў,
да якіх часам – як трэці лішні –
далучаецца й твой станік.

Уяві сабе, ноч, напоўненая каханьнем,
і, здаецца, увесь сьвет думае толькі пра адно,
а нашы майткі ляжаць
        і цнатліва чакаюць
                на піянэрскай адлегласьці,
покуль мы як найменей згадваем пра іх.

Але потым, потым,
узнагароджаныя за доўгую разлуку,
яны ўрэшце сустрэнуцца,
пераплятуцца ў гарачых абдоймах
і будуць рухацца, рухацца
ва ўсіх магчымых позах
у нашай пральнай машыне.

А пасьля,
да рэшты выціснутыя жарсьцю,
павіснуць у ваннай на суседніх вяроўках,
як пэрсанажы школьных сачыненьняў –
стомленыя, але задаволеныя.

***Інтымная гігіена***

Беручы гарачую ванну
з новым акрылавым пакрыцьцём,
бярэш заадно
і нешта да чытаньня.

Сёньня ты ўважліва чытаеш
надпіс на плястыкавым цюбіку –
крэм душ для інтымнай гігіены,
з намаляванай Афрадытай,
маса нэта 210 гр.

“Нанясеце на мачалку
альбо ўсыпеньце паміж далонямі
і нанясеце на скуру”.

Можа, з гэтай пены, – думаеш ты, –
нехта й народзіцца.
Стоп, а крэм душ – гэта што?
І чаму тады наносіць на цела?

Маўчыць намаляваная Афрадыта.
Новае акрылавае пакрыцьцё
таксама нічога не тлумачыць,
быццам бы дае зразумець,
што няма чаго выпендрывацца,
што твая задача – проста зрабіць выбар:
на мачалку ці паміж далонямі.

Але, пагрузіўшыся ў ванну
па самую эўрыку,
ты разумееш сваю бездапаможнасьць,
адчайна лыпаеш павекамі,
а літары ўсё адно размываюцца,
покуль ты расьціраеш па твары
салёную субстанцыю
для інтымнай гігіены
душ.

***Парная лічба***

Дзяўчына прыходзіць у краму.
Дзяўчына купляе рамонкавую гарбату,
пакунак на дваццаць аднаразовых пакецікаў.
Дзяўчына прыносіць пакунак дадому.
Дзяўчына выцягвае пакецікі па адным,
варожачы: “Кахае. Не кахае.
Кахае. Не кахае. Кахае”.
Хоць ведае, як бывае ў жыцьці
з парнымі лічбамі. А што рабіць?
Рамокавую гарбату на двацаць пяць пакецікаў
зноў раскупілі іншыя дзяўчаты.

KAMUNIKAT.org

## *1:50*

Штэмпэлі паштарак
грукаюць рытмічна,
як барабаны пад час карнавалу,
і ты амаль ня чуеш яе,
нават на вуліцы.

Тэлефонная картка –
недакладная карта яе голасу
ў маштабе 1:50.

(Адрэналіну ў крыві
хапіла роўна на пяцьдзясят імпульсаў,
якія цякуць
разам з кроплямі дажджу.)

А ты –
з пляшкай піва,
пад парасонам,
нібы партатыўная кавярня,
зь якой ужо ніхто нікуды не пазвоніць, –

перабіраеш пяць дзясяткаў нумароў
зь ейным голасам,
пяцьдзясят тэлефонных адзінак,
гартаючы дзіцячы бэстсэлер,
недакладную карту сваёй памяці
ў маштабе 1:50.

## *Cela est beau, comme de la prose*

Магчыма, яшчэ не яна –
не сярэдзіна,
                не экватар,
але ўсё далей на поўдзень
з памяркоўна-кантынэнтальнай
падлеткавай графаманіі
на атручаную тэрыторыю
графаманіі для дарослых,
прыўкраснай, як рыфма да ружы
ў чужой мове;

у канцэрагенныя тропікі
прафэсійнага спорту,
чые правілы забараняюць кантакт,
і ты на мяжы фолу
здабываеш чарговыя тры пункты,
трапна кінуўшы ў кош
                                для сьмецьця
скамечаны чарнавік –

сынапсыс нашага раману,
які пасьля дажыве,
                        дагуляе,
                                дапіша
нейкі, даруйце,
літаратурны нэгр.

KAMUNIKAT.org

### ***інтымны дзёньнік***

уночы разводзяцца
ногі мастоў
закрэсьліваю
масты сэнсаў
што перакідаў увесь дзень
вадаліў
па калена ў словах

карцінкі зь мінулага
душаць як фотажаба
да навальніцы

і я пераходжу
сьпярша на вэрлібр
пасьля на лытдыбр
а пасьля да акна

запавольваю пульс
адчыняю
ў кароткай пярэрве
між дзьвюх маланак

і мокрае лісьце каштанаў
цытую каштанаў цытую каштанаў
як ліст
як пасылка
спасылка
на параскіданыя ў сьвеце
твае
падзамочныя кардыёграмы

і я адчыняю
усе магчымыя вокны
шукаючы пад тваёй
віртуальнай падушкай
знаходжу і дадаю
да сваіх улюбёных старонак

KAMUNIKAT.org

***Фантомныя радасьці***

Улетку асьцярожна абыходзіць месца, на якім пасьлізнуўся й падвярнуў нагу ў лютым.

Баяцца сустрэчы з родным дзядзькам, зубным доктарам, хоць ён даўно ўжо на пэнсіі.

Шкадаваць, што бібліятэка пераехала й больш не насупраць твайго факультэту, хоць твой факультэт сам пераехаў і даўно ўжо ў будынку партыйнай школы.

Ніколі не сьпяваць улюбёнай песьні з кінафільму, пасьля якога ты атрымаў па пысе ў ваенным гарадку ў мікрараёне Ўручча.

Згадваць код перад тэлефонным нумарам, каб пазваніць у кватэру, дзе яна даўно не жыве, а каторы ўжо год жыве разам з табой.

Фантомныя радасьці. Настае момант, калі ад іх ужо не ўцячэш.

Калі ты спазьняесься на электрычку, якую сёньня адмянілі, і ты гэта ведаеш, але ўсё адно сьпяшаесься, рызыкуючы пасьлізнуцца й падвярнуць нагу.

Калі ты загаворваеш зубы бібліятэкарцы, што кажа, быццам ты пяць год не вяртаеш кніжку, якую ты ніколі ня браў, і паказвае запоўнены тваёй рукой фармуляр.

Калі, едучы на мэтро ў бок мікрараёну Ўручча, ты спрабуеш прабіць на кампостэры для ільготных талёнаў плястыкавы жэтон і разумееш, што незваротна вырас.

Калі ты хаваесься ў старой будцы тэлефона-аўтамата і звоніш адтуль па мабільніку.

Звоніш ёй.

Па ейным мабільніку.

*Ці любіце Вы Акуджаву?*

Калі табе хочацца паваражыць пра каханьне, але кава скончылася, люстэрка разьбілася, кідаць боты за суседзкі плот западло, а сьвечкі ёсьць толькі ад запальваньня аўтамабіля – скарыстайся маёй парадай.

Спытайся ў сваёй абраньніцы, ці любіць яна Акуджаву. І з усіх ног уцякай, покуль не атрымаў адказу. Калі пасьпееш уцячы, усё ў вас будзе добра. Калі не, адказ ужо ня мае значэньня. Ты прайграў.

Бо як толькі яна прамовіць “не”, ты зразумееш, што спазьніўся нарадзіцца гадоў на восемдзясят і памерці гадоў на трыццаць. Бо старому пердуну яшчэ б даравалі, а такіх, як ты, проста прыстрэльваюць.

Калі такая дзяўчына й падыдзе да цябе, каб набыць тваю кніжку вершаў, то папросіць падпісаць яе сваёй бабулі альбо любімай настаўніцы беларускай мовы Ніне Іванаўне.

Альбо дзяўчына вырашыць, што Акуджава – гэта ты, і хто яе ведае, як яна ставіцца да “асобаў каўкаскай нацыянальнасьці”.

Найгоршае тое, што ты западзеш на яе. Зь першага позірку яна ўвойдзе ў тваю сьвядомасьць – і назад адтуль ты яе ўжо ня выкурыш, хіба што вырваўшы разам з паловай зьвілінаў. Але яе як найменш будуць цікавіць твае зьвіліны. Ня верыш? Спытайся, ці любіць яна Акуджаву.

У вялікай кампаніі дзяўчат яна апынецца адзінай іншагародняй, да таго ж заручанай і пару месяцаў як цяжарнай. Альбо ахвярай, падманутай тваім калегам-літаратарам. Да таго ж якраз цяпер яна будзе зьбірацца ў манастыр. (Покуль толькі як валянтэр, але ніхто не скажа, чаго яна захоча заўтра.) Альбо прызнаецца, што цікавіцца беларускай паэзіяй. Прычым ненавідзіць вершы Хадановіча. І адразу спытае, як цябе зваць.

З усёй маладой і пераважна дзявочай аўдыторыі Акуджавам зацікавіцца толькі адна істота. Якой будзе столькі гадоў, колькі твайму бацьку. Якая будзе мець двух дарослых дзяцей. Якая, да

таго ж, будзе мужчынам. Беларускім філёзафам Валянцінам Акудовічам… Ну ды ў кожнага свае недахопы.

Але гэты сцэнар ня самы жахлівы. Бо варта дзяўчыне адказаць на тваё пытаньне “так”, як уся гісторыя вашага каханьня будзе відаць як на далоні. Вы будзеце жыць доўга і шчасьліва і ўдавіцеся ў адзін дзень.

Вось толькі некалькі з тых, што адказалі “так”. Першая напілася ў паходзе й вешалася табе на шыю падчас купаньня. Ты ледзь не патануў, выцягваючы яе з вады, а яна ўсё вісела ў цябе на шыі й патрабавала новых песень.

Другая выявілася тваёй студэнткай і паўгады тэрарызавала цябе вершамі, якім пазайздросьціў бы сам Акуджава.

Трэцяя была варшаўскай акторкай. Яна выхапіла ў цябе з рук гітару і сьпявала Акуджаву так, што ты праклінаў момант, калі атрымаў гадавую польскую візу.

З чацьвертай ты пазнаёміўся ў гасьцёх. Пачуўшы пра Акуджаву, яна прапанавала танцы, а пасьля падступна засталася з табою сам-насам у адным пакоі, замкнула дзьверы зь сярэдзіны, а на тваё асьцярожныя пратэсты адказала, каб ты нават ня думаў, бо яна зь дзяцінства займаецца таэквандо.

Зь пятай ты ўжо дзевяць год жывеш у шлюбе. І хоць здараецца рознае, адчуваеш трывожнае шчасьце, якое так лёгка сапсаваць, але покуль што ўсё цьху-цьху-цьху. Можа, менавіта таму, што ты з усіх сілаў спрабуеш не пытацца ў яе, ці любіць яна Акуджаву?

* * *

Які малы гэты сьвет,
гэтая Эўропа,
Беларусь,
Летува,
Польшча,
Нямеччына,
Чэхія!
І якая доўгая вуліца Завальная,
калі, раз-пораз то ўлева,
то ўправа завальваючыся,
цягнесься на віленскі аўтавакзал,
каб – праз Польшчу,
Нямеччыну
й Чэхію –
нарэшце вярнуцца да той,
што прасіла цябе не напівацца!

***Апошняе мэтро***

Перакуленая падкова
бэрлінскага ***U***-бану
абяцае шчасьце ўсім,
хто верыць у прыкметы.

І я калекцыяную падземнае шчасьце,
тыкаючы пальцам у новыя й новыя
станцыі ў схеме мэтро.
...Восем, дзевяць, дзесяць –
нібыта зьбіраю падковы.

Кожны дзень я раблюся
ўсё больш і больш падкаваным
у арытмэтыцы,
каб аднойчы пачаць адваротны адлік.

...Дзесяць, дзевяць, восем
шчасьлівых падковаў
да перасадкі на праскі,
а потым на менскі,
а потым шэсьць станцый мэтро,
тры прыпынкі ў старэнькім гарбатым
ці новым зялёным...

А пасьля на другі паверх,
абняць, падвесьці да ложка
і перакуліць – на шчасьце.

kamunikat.org

***Прыватная тэрыторыя***

“Прыватная тэрыторыя – ўсе пайшлі нах!” –
як мага болей ветліва кажа мне шыльда,
за шыльдаю плот, з таго боку сядзіба, газон, узьбярэжная і
палоска вечнага кайфу з блакітнымі лёгкімі хвалямі.

Уверсе ні хмаркі, навокал плюс сорак,
вочы ня бачаць ад поту, а побач
яшчэ прыватная тэрыторыя,
і яшчэ адна, і яшчэ, а таму,
калі хочаш дайсьці да легальнай вады,
мусіш паўзьці ў абыход, калі хопіць сілы паўзьці,
дваццаць хвілінаў паўз плот, і наступны
з шыльдай: “Прыватная тэрыторыя – ўсе пайшлі нах!”
І ідуць, а што застаецца?..

Неяк я плыў на пароме па возеры й бачыў
тыя ўзьбярэжныя зь іншага боку,
і ўбачыў такое, што сьцяміў:
яны абсалютна ня сукі, а проста
ёсьць рэчы, якімі ты нават хацеў бы
з кімсь падзяліцца, але ацаніць іх магчыма адно
пахадзіўшы па сьпёцы, паплаваўшы ў іншай вадзе
і зірнуўшы зь іншага боку.

Я зразумеў трохі больш пра цябе і мяне,
і я больш не крыўдую на гэтыя блядзкія шыльды.

Кожнага разу, калі захачу апісаць вечны кайф,
найлепшае, што я змагу –
гэта матам абкласьці іх: “Добрыя людзі,
я вельмі прашу, калі ласка, ня трэба
заходзіць: прыватная – плот – тэрыторыя – шыльда!
Усё, што магу, калі хочаце, прапанаваць –
гэта шпацыр на дваццаць хвілінаў убок
церазь сьпёку, а потым заплыў
праз сумнеўныя хвалі, што я тут ганю –
і погляд зь іншага боку...
Калі хопіць сілы даплысьці”.

***Вучуся хадзіць***

“Калі ты пачнеш пісаць дзіцячыя вершы?” –
пытаюцца ў мяне.

А я ня ведаю.
Я шчэ вельмі далёкі ад пісьменнасьці.

Покуль я толькі вучуся хадзіць,
трымаючыся за твой вазок.
Толькі вучуся ў цябе першым словам.

Раней я думаў, што сіла –
гэта калі падымаеш цяжкую гантэль,
потым пудовую гіру,
потым двухпудовую…
Цяпер я падымаю на рукі твой вазочак
і спускаю яго па сходах, але так,
каб ты не прачнулася.

І добра, што навокал дождж,
а я без парасона,
усе акуляры ў кроплях
і мінакам не відаць,
што ў мяне зараз на вачах.

Але да дзіцячых вершаў
гэта ня мае ніякага дачыненьня,
бо табе чытаць пра такое,
дзякуй Богу, яшчэ не цікава.

kamunikat.org

***Плакалі, знаем!***

Хлопчык трох гадоў
крочыць побач з маці,
а потым як зваліцца,
як трахнецца аб асфальт!
Каленка разьбітая ў кроў,
але ня плача,
трохгадовыя мужчыны ня плачуць,
падымаецца, атрасаецца
і незалежным тонам прамаўляе:
“Ледзь ня ўпаў!”

Хлопчык чатырох гадоў
ляжыць на апэрацыйным стале
і вось-вось заплача,
бо які ён ужо мужчына,
калі цёця доктар корпаецца
чымсьці жалезным яму ў пісі,
дзякуй, хоць бацькоў не пусьцілі.

Хлопчык пяці гадоў
дачакаўся смачнай перадачы
у свой загарадны тубэркулёзны санаторый,
і на радасьцях зьеў яе ўсю,
вось толькі памыліўся шафаю,
а потым дзяўчынка нешта шукала ў ёй,
нічога не знайшла й заплакала,
і хлопчык зь ёй за кампанію,
бо хрэн зь імі, з апэльсінамі,
у санаторыі карантын
і бацькоў зноў не пусьцілі,
вунь яны там, за акном,
махаюць яму рукамі,
покуль ён жарэ чужую перадачу...

Бацька трохмесячнай дачкі
па дарозе ў лазэрную клініку
падслухоўвае размову.

Хлопчык трох гадоў

крочыць побач з маці.
“Мама, а ведаеш, ты таксама памрэш!”
“Што ты такое вярзеш?!
Ты што, хочаш, каб твая мама памерла?”
“Не, я не хачу. Я проста нагадваю”.

Госпадзе,
хай доктарка з лазэрнай лінзаю не памыліцца,
беражы ў дарозе ўсіх Тваіх разьдзяўбаеў,
усіх сьляпых
і тых, каму сёньня закапалі вочы.

KAMUNIKAT.org

# Зьмест

Дзіцячая чыгунка

**I. Касец газонаў**
Стары паэт
Прагрэс у літаратуры
Самсон
Арфэй, Эўрыдыка, герпэс
Касец газонаў
“Усё жыццё табе здаецца...”
Гадзіны гвалту
Лятэрэя
Чэмпіянат сьвету па акынскай паэзіі
даверасьнёўская лірыка

**II. Пераключаючы каналы**
“Чужая мова...”
*Зь нізкі “Неба над Бэрлінам”*
Гарачая пяцёрка бэрлінскіх навінаў
Драйв
Сухі закон
Прагноз надвор’я
Пайсьці і не вярнуцца
Унтэр дэн Ліндэн
Пераключаючы каналы
Commedia
Смачна есьці!
Чысьціня über alles
Полтэргайст
У гасьцях у казкі
Справаздача
Поры году
*Зь нізкі “Аб кавярнях менскіх праўда”*
Двухпавярховая краіна
Дзьве гадзіны ў рэзэрвуары
Ад смагі паміраю ў “Экс-Крыніцы”

**III. Успомніць усё**
Чэмпіянат Эўропы
Жаночы футбол

KAMUNIKAT.org

Біятлён
Вэлягонка пратэсту
Валасы-2006
Успомніць усё
Ачысткі сумленьня
Адносная вільготнасьць
Прэзумпцыя невінаватасьці
Underground
Вершы пра Н.Н.
Вершы пра Н.Б.
Камары думаюць пра Беларусь

**IV. Апошняе мэтро**

Азёрная школа паэзіі
Любоўная вайна
Постымпрэсіянізм
Оптыка
Пра твае і мае майткі
Інтымная гігіена
Парная лічба
1:50
Cela est beau, comme de la prose
інтымны дзёньнік
Фантомныя радасьці
Ці любіце Вы Акуджаву?
“Які малы гэты сьвет…”
Апошняе мэтро
Прыватная тэрыторыя
Вучуся хадзіць
Плакалі, знаем!

KAMUNIKAT.org